У такіх выпадках дзеяслоў *ісці* губляе лексічную паўназначнасць і ў спалучэннях з назоўнікамі *гук, песня, гаворка, гутарка, бяседа, пагалоска, чутка* выражае спецыфіку гучання чаго-небудзь, працэс вядзення гутаркі, яе праўдзівую ці ілжывую напоўненасць. Розныя параметры дзеясловаў руху і перамяшчэння пераносяцца на свет міжасабовых адносін і сацыяльную прастору, а таксама на выражэнне фрагментаў экзістэнцыяльнага і ментальнага працэсаў.

*С. А. Сычова (Беларусь)*

## МІФАЛАГІЧНЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА «ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА» І ВАЛЕРЫЯ ГАПЕЕВА «НОЧ ЦМОКА»

Міфалогія раскрывае разуменне чалавекам таямнічага свету. Зварот да міфалогіі ў літаратурных творах, пачынаючы з XIX стагоддзя, дазваляе раскрыць не толькі ўнутраны свет героя, але і выявіць нацыянальную састаўляючую ў ім. Міфалагічныя дынамічныя матывы ў творах выводзяць мастацкую сітуацыю са стану раўнавагі, яны звязаны з адлюстраваннем актыўнага дзеяння.

Творы Уладзіміра Караткевіча і Валерыя Гапеева аб’ядноўвае дэтэктыўны сюжэт, прасякнутасць міфалагічнымі вобразамі. У абодвух творах таямнічасць дае рух сюжэту, раскрывае псіхалагічную сутнасць падзей, дазваляе паказаць грамадства з розных бакоў.

У. Караткевіч фактычна з’яўляецца заснавальнікам гістарычнага дэтэктыва. Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» – твор шырока вядомы, чытаемы. Апавядальнік Андрэй Беларэцкі, якому 96 год, узгадвае пра падзеі, удзельнікам якіх быў сам. Аўтар расказаў не толькі паданні, якія існавалі ў той мясцовасці, але і магчымасць выкарыстання іх дзеля дасягнення сваіх эканамічных інтарэсаў.

Галоўная гераіня Надзея Яноўская верыць у непазбежнасць пакарання за грахі продкаў. Захапленню чытача сюжэтам спрыяе і разуменнне, якое з’явілася ў Андрэя Белабоцкага перад адным з партрэтаў. Ён «зразумеў перад гэтым партрэтам, якая страшная штука «род», якую пячаць ён накладае на нашчадкаў, які цяжар старых грахоў і выраджэння кладзецца на іхнія плечы» [2, с. 20]. Такім чынам узнікае адчуванне, што размова вядзецца не толькі пра прыватны выпадак, а і пра глабальныя рэчы.

У творы паступова ўзнікаюць міфалагічныя істоты, палохаючы маладую гаспадыню маёнтка, паступова даводзячы яе да стану, які мяжуе з вар’яцкім. Прычым кожная з дзеючых асоб мае сваю мэту.

Людзі вакол Надзеі выкарыстоўваюць яе перакананні дзеля дасягнення сваіх мэтаў. Ахмістрыня Закрэўская спрабуе знайсці паперы, што падцвердзяць яе дваранства. Бергман таксама спрабуе атрымаць свой «кавалак». Ён ведаў, што з’яўляецца сваяком Яноўскіх і можа атрымаць частку спадчыны, таму па дому ходзіць Малы Чалавек Балотных Ялін. Бергман прывёз малога чалавека (нібы брата), які і стаў гэтым Чалавекам.

У выніку расследавання даведваюцца, што ідэйным лідарам Дзікага палявання быў Дубатоўк. «Гэта ўсё Дубатоўк. Палац Яноўскіх павінен быў перайсці да Гарабурды, але Гарабурда вельмі запазычаўся Дубатоўку. Ніхто пра гэта не ведаў, акрамя нас, людзей Дубатоўка» [2, с. 179]. А яму так патрэбен быў гэты палац, што ён не спыніўся перад забойствам.

Адначасова гучыць думка пра заняпад шляхты, падмену яе прызначэння. «Шляхта памірае. Калісь мы былі моцнымі як камень, а зараз мы… ведаеце, калі раскалоць камень са старога будынка, як ён разваліцца, у ім будуць

слімакі» [2, с. 97]. У творы тлумачыцца і прычына, па якой шляхціцы падтрымалі ідэю Дубатоўка са з'яўленнем Дзікага палявання: сяляне будуць баяцца і падпарадкоўвацца.

Разумнай і больш высакароднай сілай паказаны сяляне, якія не толькі выратоўваюць Яноўскую, але і змагаюцца за свае правы. Аўтар раскрывае сутнасць народнай душы ў словах Рамана: «Але цярпець дык цярпець, а калі пачалі ўжо – дык да канца. Каб ніводнага не пакінуць, каб толькі мы адны, пад кругавой парукай ведалі» [2, с. 186].

У аповесці Уладзімір Караткевіч выкарыстаў міфалагічныя матывы не толькі для развіцця сюжэта, але і для раскрыцця сутнастных пытанняў грамадства: шляхецкай і чалавечай годнасці, паняцця маралі, панавання грошай, жаданне сцвердзіць свой сацыяльны статус, прыдбаць тое, што табе не належыць.

У рамане Валерыя Гапеева «Ноч цмока» малады следчы Васіль Шайбак расследуе дзіўнае забойства жанчыны. Дзіўна ў ім усё, пачынаючы з самога цела забітай. «Але жанчына на мяккай посцілцы баранаванай зямлі ўдавала з сябе жывую. Настолькі жывую, што цягнула падысці і прыкрыць сваім пінджаком яе аголеныя сцёгны» [1, с. 20].

Усе падзеі скіраваны на пошук забойцы. Дзеля дасягнення мэты даследуюць жыццё Насці Грыцук, у якім знаходзяць шмат цікавага і незвычайнага. Яе бацька быў ведзьмаком, яна ніколі не сустракалася з мужчынамі. Узнікаюць шматлікія пытанні, на якія складана знайсці адказы.

У творы паступова раскрываецца ўзровень свядомасці народа, паказваецца яго вера ў звышнатуральныя сілы. Падчас пошукаў забойцы Насці аўтар паказвае чым, у якіх умовах жывуць людзі, што іх цікавіць. «Нават самы бязглузды на першы погляд рытуал некалі быў важным і асэнсаваным дзеяннем» [1, с. 37]. І самае цікавае тое, што гэтыя рытуалы канчаткова не зніклі, праявы іх жывуць у свядомасці людзей. Напрыклад, яны вераць у ведзьмакоў, іх моц, неабходнасць выканання рытуалаў пры нараджэнні і сыходзе з жыцця.

Асаблівае месца займае вобраз цмока і вераванні, звязаныя з ім. «Міф кажа нам, што выява цмока пад вокнамі – шанаванне магутнай сілы і адначасова разлік на спагарду… Цмок – наша агульная абарона і надзея на шчасце» [1, с. 286]. Даецца тлумачэнне, чаму тры гады трэба насіць яйка пад пахай, і тады з яго вылупіцца цмок, чаму важна ноч цмока, гучыць ідэя нараджэння нацыянальнага лідара.

Герой сутыкаецца з невядомымі праявамі нацыянальнай свядомасці, пачынае інакш глядзець на падзеі, з'яўляецца жаданне далучыцца да нечага большага. Ён разумее, што «не спадчынная інтэлігентнасць, не веды і адукацыя, не шляхецтва ў паводзінах, а менавіта здольнасць адчуваць у сабе адказнасць за іншых, за краіну» [1, с. 297] павінны рухаць дзеяннямі чалавека.

Дэтэктывы У. Караткевіча і В. Гапеева напісаны ў розны час, зварот да міфалагічных вобразаў абумоўлены цікавасцю да духоўнага жыцця грамадства. У. Караткевіч паказаў, як вера ўплывае на свядомасць людзей, як паданні выкарыстоўваюць дзеля дасягнення сваіх матэрыяльных выгод. В. Гапееў выявіў рэшткі міфалагічнага мыслення ў свядомасці сучаснікаў, іх уплыў на жыццё. Варта адзначыць, што абодва творы закранаюць пытанне нацыянальнага вызначэння народа і роль міфічных вобразаў у ім.

**Літаратура**

1. Гапееў, В. Ноч Цмока : раман / В. Гапееў. – Мінск : Галіяфы, 2016. – 356 с.
2. Караткевіч, У. Збор тораў : у 8 т. – Мінск : Маст. літ., 1990. – Т. 7: Дзікае паляванне караля Стаха: Аповесць; Чорны замак Альшанскі: Раман. – 574 с.